У САМЫМ СЭРЦЫ ТЭРЫТОРЫІ «Ч»

Знак пачатку Хойніцкага раёна на колішняй дарозе-брукаванцы Даўляды—Краснаселле

Лабараторыя радыяхіміі. Калектыў супрацоўнікаў — Аляксандр Машэўскі, Мікалай Дземенкавец, Эдуард Калыхан і Віктар Калінін — з дапамогаю бэта-гама спектрометра вымяраюць узровень назапашвання радыяцыі ў драўніне.

Выгляд 30-кіламетровай адселенай зоны. На першым плане — колішні жывёлагадоўчы комплекс за вёскай Пагоннае

Намеснік дырэктара па навуковай працы, кандыдат хімічных навук Юрый Бондар і вядучы навуковы супрацоўнік аддзела экалогіі фаўны Таццяна Дзярабіна значную частку свайго жыцця прысвяцілі даследаванню чарнобыльскай зоны.

Табун запаведніка — сапраўднае ўпрыгожанне бязлюдных краявідаў.

Абавязковы восеньскі догляд пчол. Леснікі Сяргей Красоўскі і Анатоль Котчанка робяць падкормку, апрацоўку пчол ад кляшчоў, перадзімовае ўцяпленне.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, менавіта сёлета спаўняецца 25 гадоў з часу надання тэрыторыі адчужэння статусу запаведніка (створаны быў праз два гады пасля аварыі на ЧАЭС, у 1988 годзе). Зямля, якая зведала неймаверныя пакуты, з крыніцы небяспекі зрабілася тэрыторыяй загадкавай і таямнічай, каштоўнай у плане новых даследаванняў, эксперыментаў і адкрыццяў. Усё часцей навукоўцы кажуць, што радыяцыйна-экалагічны запаведнік павінен ператварыцца ў навуковую пляцоўку сусветнага ўзроўню. Штодня тут вядуцца маніторынгі экалогіі — глебы, вады, паветра, расліннага і жывёльнага свету. Чвэрць стагоддзя збіраецца бясцэнны матэрыял, якога ў сусветнай практыцы яшчэ не было.

Перад наведваннем 30-кіламетровай тэрыторыі я сустрэўся з **дырэктарам Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка Пятром КУДАНАМ** і вось што даведаўся:

— У запаведніку сёння працуе 740 чалавек — леснікі, вартавыя КПП і работнікі службы аховы, навукоўцы, дазіметрысты, абслуговы персанал. Адной з першых функцый запаведніка было забеспячэнне ахоўнасці ад несанкцыянаванага пранікнення на забароненую тэрыторыю (мэты знаходжання былі самыя розныя — паляванне, збор дароў лесу, вынас і вываз бытавых прадметаў) — каб уберагчы людзей ад залішняга апраменьвання. Па-ранейшаму адной з першасных задач застаецца зніжэнне ўздзеяння радыяцыі на здароўе персаналу. Адказнасць за гэта ўскладзена на аддзел радыяцыйнага кантролю і рэжыму.

У першыя гады шмат высілкаў трацілася на ліквідацыю пажараў, якія ў асноўным узнікалі ад наўмысных падпалаў. Але з падтрымкаю дзяржавы вырашаны шэраг важных задач па стварэнні больш надзейнай сістэмы супрацьпажарнай бяспекі. Напрыклад, узведзена 37 металічных назіральных вышак, з якіх тэрыторыя праглядаецца цалкам. Лясныя масівы размежаваны шырокімі разрывамі, якія рэгулярна пераворваюцца. Цяпер у 30-кіламетровай зоне вырыта некалькі дзясяткаў вадаёмаў, дзе можна рабіць тэрміновую дазапраўку пажарных машын. Калі раней выгаралі тысячы гектараў, дык апошнім часам за год узнікае ўсяго 2-3 лакальныя ўзгаранні прыроднага паходжання. Напачатку стварэння запаведніка агнём знішчаліся цэлыя вёскі, як, напрыклад, Даўляды ў Нараўлянскім і Кажушкі ў Хойніцкім раёнах. Цяпер матэрыяльныя страты ад агню зведзены да мінімуму. Але станоўчы момант яшчэ і ў тым, што супрацьпажарныя дзеянні не даюць адбыцца другаснаму забруджванню прылеглых да запаведніка і больш аддаленых тэрыторый.

За гэты час адбылося фарміраванне калектыву, створана грунтоўная база для навуковых даследаванняў. Навукоўцы распрацавалі і здзейснілі шэраг айчынных праектаў і праектаў Саюзнай дзяржавы, СНД, выходзяць на сусветны ўзровень. Удзельнічаюць у некалькіх індывідуальных праектах з Нарвегіяй і Германіяй. Рыхтуецца яшчэ шэраг праектаў па міжнародных праграмах.

Пры падтрымцы МАГАТЭ ўдалося папоўніць навуковыя лабараторыі самым сучасным абсталяваннем. Цяпер лабараторыі лічацца аднымі з лепшых у краіне — у іх з высокай дакладнасцю вымяраецца ўвесь спектр радыенуклідаў.

Адначасова з навукова-доследнай, запаведнік займаецца і эксперыментальнай работай, вядзе пазабюджэтную дзейнасць.

— Выжываць самастойна нам цяпер вельмі складана, — кажа кіраўнік запаведніка. — Але сядзець на шыі ў дзяржавы бясконца таксама нельга. Дарэчы, з бюджэту дзяржавы на функцыянаванне запаведніка штогод расходуецца больш за 5 мільярдаў долараў. У адрозненне ад іншых запаведнікаў, мы не можам праводзіць турыстычную дзейнасць — з-за фактару рызыкі, але праз міжнароднае супрацоўніцтва пашыраем кантакты. А яшчэ імкнёмся зарабляць грошы гаспадарчай дзейнасцю. 18 гадоў адпрацоўваем сучасныя тэхналогіі атрымання чыстай сельгаспрадукцыі на забруджаных тэрыторыях. Дзеля гэтага на ўскраіне запаведнай тэрыторыі было адведзена 700 гектараў зямлі. Спачатку заклалі пладова-костачкавы сад. Пазней разгарнулі эксперыментальны пчальнік, які налічвае 80 пчоласем'яў. Каля 15 гадоў таму пачалі разводзіць пародзістых коней. Калі выявілася, што каніну ў рэалізацыю пускаць нельга, сталі займацца племянной конегадоўляй, і сёння маем табун болей за 300 галоў.

Сёлета ад сваіх пчол у запаведніку атрымалі болей за тры тоны мёду. За мёд выручылі больш за 100 мільёнаў рублёў. Пры тым, што максімальныя затраты па доглядзе пчол склалі ўсяго 40 мільёнаў. Першыя гады пчалярства паказалі, што мёд у сотах радыеактыўны, таму пачалі засяваць меданосы на чыстых кавалках глебы — і мёд стаў сапраўды чыстым. Тым не менш пастаянна робіцца кантроль мёду на наяўнасць радыенуклідаў.

Штогод гаспадарка прадае па паўсотні галоў коней — і сельскагаспадарчым арганізацыям, і кумыснай ферме, і мясцоваму насельніцтву таксама.

Зусім нядаўна (не болей за год) прыняты Закон аб ахоўна-прававым рэжыме запаведніка, узмацніўся яго ахоўны статус.

— Стала лягчэй па частцы ахоўных правоў. У нас з'явілася болей правоў. У насельніцтва — больш абавязкаў, — сказаў Пётр Кудан. — Напрыклад, рака Прыпяць, якая дзеліць тэрыторыю запаведніка, доўга заставалася нейтральнай, плыць па ёй можна было любому. Было шмат браканьерства, несанкцыянаваных пранікненняў на забароненую тэрыторыю. Цяпер знаходзіцца на рацэ ў межах запаведніка можна толькі з дазволу адміністрацыі зоны адчужэння.

Важнасць узмацнення ахоўнасці запаведнай тэрыторыі асабліва падтрымліваецца навуковымі супрацоўнікамі, якія назіраюць устойлівасць пражывання рэдкіх відаў жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу — бурага мядзведзя, еўрапейскай рысі, барсука, еўрапейскага зубра. З 2007 года ў запаведніку з'явіліся коні Пржавальскага. Вядучы **навуковы супрацоўнік аддзела экалогіі фаўны запаведніка, кандыдат біялагічных навук Таццяна ДЗЯРАБІНА** працуе ў гэтай установе ўжо 12 гадоў. І з кожным годам яе інтарэс да жывёльнага свету на забруджанай тэрыторыі ўзрастае.

— Гэта не сакрэт, што з паўраспадам цэзія, стронцыя і з'яўленнем новага прадукту распаду плутонія — амерыцыя — паўстае пагроза назапашвання ў органах жывёл яшчэ малавывучаных элементаў. Але відаць, што на свабоднай ад гаспадарчай дзейнасці і ад прысутнасці чалавека тэрыторыі жывёлы пачуваюць сябе ў поўнай бяспецы, асяроддзе іх поўнасцю задавальняе.

Да свайго юбілею «зона» таксама рыхтавалася — часткова пакладзены новы асфальт, свежай фарбай красуюцца папераджальныя паказальнікі. Упершыню каля вёскі Краснаселле з'явіўся надпіс: «Тэрыторыя з высокім узроўнем радыеактыўнага забруджвання па плутоніі». Праведзена ўпарадкаванне службовых памяшканняў і прылеглых тэрыторый 11 КПП.

З 35-метровай вышкі, усталяванай пасярэдзіне колішняй вёскі Краснаселле, добра відаць абрысы Чарнобыльскай атамнай станцыі — саркафаг над 4-м энергаблокам, недабудаваная пакуль канструкцыя «Укрыццё», пад якой будзе схаваны раз'юшаны рэактар. Гэты малюнак — нібы сімвал новага часу, па якім, хочам мы таго ці не, ужо адмерана цэлая чвэрць стагоддзя.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Хойніцкі раён.

■ Шпацыр па Камароўцы

ГРЫБНОЕ РАЗДОЛЛЕ І ТОЛЬКІ АЙЧЫННЫЯ ЯБЛЫКІ

Грыбнікі па ўсёй краіне з імпэтам абследуюць усе магчымыя лясы, прыхапіўшы з сабой як мага большыя кошыкі: восень парадавала грыбамі. Карэспандэнт «Звязды» адправілася на «ціхае паляванне» на... сталічны Камароўскі рынак...

...Грыбоў на рынку цяпер і сапраўды поўна, прычым на любы густ: пачынаючы ад апенек і заканчваючы адборнымі баравікамі. Так, за трохлітровае вядзерца просяць 100 тысяч рублёў. Прычым, калі пакупнікі кажуць нешта накшталт «пайду яшчэ павыбіраю», многія прадаўцы хуценька рэагуюць на сітуацыю, збіваючы кошт да 95, а пасля нават і да 80 тысяч. А што ж рабіць, калі локаць у локаць стаяць побач такія ж гандляры з такім жа таварам.

За трохлітровае вядзерца абабкаў просяць 55 тысяч, а за такую ж колькасць чырвонагаловікаў — 60. Прыгатаваць марынаваныя апенькі можна параўнальна нядорага: літровая пасудзіна гэтых грыбоў абыдзецца ў 10 тысяч рублёў. Лісічкі каштуюць 25 тысяч за паўлітра.

Сезонныя брусніцы, відавочна, карыстаюцца попытам, бо на іх кошт прадаўцы зніжаць не спяшаюцца, нават калі пакупнікі адходзяць. 20 тысяч за літр давядзецца аддаць тым, хто надумаў пакаштаваць гэтыя ягады з Камароўкі.

З часоў мінулага «шпацыра» крыху падраслі кошты на некаторую агародніну і зяленіва. Так, кропу і пятрушкі па 3 тысячы за пучок ужо наўрад ці ўдасца знайсці, амаль усё зяленіва на рынку цяпер каштуе па 8-10 тысяч за 100 грамаў, хіба што зялёная цыбуля прадаецца па 4 тысячы за тую ж вагу. Падаражэлі і баклажаны. Калі пару тыдняў таму за кілаграм прасілі 10 тысяч рублёў, то цяпер гэтая гародніна каштуе па 18 тысяч. Кіло сініх сліў каштавала ад 12 да 14 тысяч, а цяпер жа за яго просяць ад 13 да 18 тысяч.

А вось вінаград, наадварот, патаннеў. Цяпер за кілаграм салодкіх ягад давядзецца аддаць ад 14 да 20 тысяч, а не 18 — 25. Патаннела крыху і морква. Кіло цяпер можна набыць за 5 тысяч рублёў — на 1,5 — 2 тысячы менш, чым гэта было пару тыдняў таму. На дыні (ад 12 да 18 тысяч за кілаграм) і кавуны (4,5 тысячы за кіло) таксама паменшыліся кошты. Нядаўнія лічбы на цэнніках былі такімі: ад 18 да 22 тысяч і 5 тысяч за кіло.

На рынку амаль не прадаюць замежных яблыкаў. Адзіныя, што ўдалося знайсці, — чылійскія, за 15 тысяч. Кошты на беларускія пачынаюцца ад 9,5 тысячы, прычым выбраць можна на любы смак: ад кіслай і цвёрдай антонаўкі да салодкага чырванаватага ранету.

У крытым рынку на мясных радах кошты размяркоўваюцца наступным чынам. Найбольш «небюджэтнае» мяса, вядома, цяляціна. За кілаграм кумпяка просяць ад 183 да 185 тысяч. Кіло паляндвіцы каштуе ад 185 да 189 тысяч, лапатку прапануюць па 120-125 тысяч, а кілаграм шыйнага кавалка абыдзецца ў 95—110 тысяч. Ялавічына не нашмат адстае па лічбах. Так, за кіло кумпяка давядзецца аддаць ад 165 да 180 тысяч, такі ж кавалак паляндвіцы можна набыць па кошце ад 165 да 180 тысяч. Іншыя часткі мяса — лапатка і шыя — каштуюць 110—115 і 95—110 тысяч адпаведна.

Свініна на гэтым фоне выглядае нашмат больш выгаднай пакупкай. Кілаграм шыйнага кавалка абыдзецца ў 84—85 тысяч, паляндвіца каштуе 80—85 тысяч за кілаграм, на кіло кумпяка давядзецца выдаткаваць ад 65 да 68 тысяч, а за лапатку просяць 58—60 тысяч. Свежае сала, у залежнасці ад таўшчыні, можна набыць па кошце ад 35 да 59 тысяч, а салёнае з прыправамі абыдзецца ў 79,5 тысячы за кілаграм.

Каб набыць курынае філе, давядзецца выдаткаваць ад 50 да 58 тысяч за кілаграм, галёнка каштуе 28—30 тысяч, а сцягно — 31—34 тысячы за кіло. За дзясятак яек на Камароўскім рынку просяць ад 10 да 13 тысяч рублёў.

Калі пакаштаваць мяса ці птушку — зусім не тое, чаго хацелася б, вам да латкоў са свежай рыбай. Цяпер на Камароўцы, акрамя карпаў (23—27 тысяч за кіло) і карасёў (14 тысяч), гандлююць і маладым шчупаком. Кілаграм такой смакаты абыдзецца ў 30 тысяч рублёў. «Заморская» рыба, зразумела, толькі замарожаная альбо салёная. Напрыклад, кілаграм свежамарожанага хека абыдзецца вам у 49—50 тысяч, такая ж сёмга каштуе ад 169 да 170 тысяч за кілаграм, філе траскі — 89 тысяч, а цэлую чырвоную замарожаную траску можна пакаштаваць, заплаціўшы ад 45 да 47 тысяч за кілаграм.

Кошты на некаторыя віды салёнай і вэнджанай рыбы наступныя: салёная сёмга — 320 тысяч, фарэль — ад 267 да 270 тысяч за кілаграм. Вельмі эканомны варыянт на фоне вышэйзгаданай экзотыкі — салёны селядзец па кошце 32,2 тысячы. А вось вэнджаная скумбрыя «кусаецца». За кілаграм просяць ад 92 да 93 тысяч.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■

Лічыльнік «Звязды» (кошты за кілаграм, калі не пазначана іншае):

Грушы — 10—35 тысяч
Персікі — 18—25 тысяч
Лімоны — 26—30 тысяч
Лаймы — 100 тысяч
Бананы — 11 тысяч
Памідоры — 13—26 тысяч
Агуркі — 16—18 тысяч
Кабачкі — 5 тысяч
Радыска — 10 тысяч (1 пучок)
Капуста — 3—4 тысячы
Бульба — 4—6 тысяч
Цыбуля — 8—30 тысяч
Буракі — 3,9 тысячы
Кальрабі — 5—6 тысяч
Шампіньёны — 24—29 тысяч
Кансерваваны гарох — 5—7 тысяч (за бляшанку)
Грэчка (800 г) — 7—8 тысяч
Алей сланечнікавы — 13—17 тысяч (1 л)
Мука— 12—13,5 тысячы (2 кг)
Цукар — 7,5—8,4 тысячы (1 кг)
Рыс — 6—18 тысяч (900 г)
Грэчка — 7—8 тысяч (800 г)
Фасоля — 17—18,5 тысячы (800 г)

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ГУЛЬНІ ПАРЛАМЕНТАРЫЯЎ. СПАРТЫЎНЫЯ

20 верасня ў Маскве пачаліся чацвёртыя Міжнародныя парламенцкія гульні, у якіх бяруць удзел беларускія дэпутаты Нацыянальнага сходу.

У першы дзень спаборніцтваў беларусы паспяхова выступілі па вялікім (Вадзім Дзевятоўскі і Эдуард Сянькевіч) і настольным (Аляксей Кузьміч) тэнісе, бадмінтоне (Яўген Абаленскі), міні-футболе. 21 верасня беларускія футбалісты сустрэнуцца ў чвэрцьфінале з камандай Сербіі. У суботу таксама ў барацьбу за прызавыя месцы ўступяць шахматысты.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«ТАЛЕНАВІТЫЯ РАЗАМ»

У Віцебску сёння стартаваў усебеларускі фестываль-конкурс сямейнай творчасці «Таленавітыя разам».

На сцэне абласной філармоніі выступаюць творчыя сямейныя ансамблі і нават калектывы з некалькіх сем'яў. Гледачам прапануецца вельмі насычанае «меню»: вакальныя, харэаграфічныя, музычна-інструментальныя нумары і выступленні арыгінальнай жанравай формы, тэатралізаваныя пастаноўкі і іншае — усё, на што толькі здольныя канкурсанты.

— Фэст праводзіцца ў другі раз. Сямейная творчасць — гэта не проста забаўка або адкрыццё новых талентаў, а ў першую чаргу — згуртаванне бацькоў і дзяцей, умацаванне сувязі пакаленняў. Віцебскі фестываль як шматнацыянальнае свята творчасці нясе ў свет жыццесцвярджальныя ідэалы сям'і, ідэі міру, дружбы, — паведамілі ў арганізацыйным камітэце фэсту.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АТРУЦІЛІСЯ Ў ШКОЛЕ

У Мазыры больш за 70 вучняў трох гарадскіх школ і адной гімназіі практычна адначасова звярнуліся па дапамогу ў бальніцу. Гэтым фактам цяпер займаецца ў тым ліку Мазырскі раённы аддзел Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Ва ўсіх дзяцей, якіх бацькі прывезлі ў інфекцыйнае аддзяленне гарадской бальніцы на працягу другой паловы дня 19 верасня і ноччу 20 верасня, выяўлены сімптомы харчовага атручвання. 13 чалавек шпіталізаваны. Папярэдні дыягназ: «харчовая таксікаінфекцыя». У Мазырскім райвыканкаме прайшло тэрміновае пасяджэнне спецыяльнай камісіі, якая высвятляе, якімі прадуктамі маглі атруціцца школьнікі (пераважна вучні пачатковых класаў). Дарэчы, большасць з іх пасля прамывання страўніка адпусцілі дадому. Вядома, што вучні 1-7 класаў ужывалі ў ежу на сняданак бульбяное пюрэ, адварную каўбасу, салату з агародніны і глазураваныя сыркі, а вечарам пачалі скардзіцца на боль у страўніку.

Падчас тэрміновай праверкі супрацоўнікі раённага і абласнога апарата Следчага камітэта сумесна з супрацоўнікамі Мазырскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі правялі агляд харчаблокаў і сталовых дзвюх гарадскіх школ і гімназіі, адкуль было больш за ўсё атручаных дзяцей. Афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Беларусі па Гомельскай вобласці Марыя Крыванога расказала таксама, што былі апытаны кіраўнікі ўстаноў адукацыі, загадчыкі вытворчасцю, супрацоўнікі сталовых. Прадукты харчавання ўзяты для правядзення неабходных даследаванняў. Аналагічныя мерапрыемствы будуць праведзены і ў іншых школах. Па выніках праверкі будзе прынята адпаведнае працэсуальнае рашэнне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВЫВЕЛІ З ЛЕСУ

Толькі за адны суткі выратавальнікі вывелі з лесу трох грамадзян, якія там заблудзілі.

У лясным масіве каля вёскі Граболава Чавускага раёна «прапалі» дзве жанчыны. Для правядзення пошукаў прыцягваліся не толькі работнікі МНС, але і міліцыянеры. Увечары жанчыны выйшлі на гук святлосігнальнай устаноўкі. А каля вёскі Цыкуны Гомельскага раёна ў лесе заблукаў пенсіянер: пайшоў у грыбы і не вярнуўся. Мужчыну 1943 года нараджэння адшукалі выратавальнікі. Ніхто з гэтых грамадзян у медыцынскай дапамозе патрэбы не меў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЦІХАЕ ПАЛЯВАННЕ ЗАКОНЧЫЛАСЯ Ў БАЛОЦЕ

Ля вёскі Цыкуны ў Гомельскім раёне заблудзіўся 70-гадовы мужчына. Раніцай ён пайшоў у грыбы, а вечарам патэлефанаваў сыну і паведаміў, што не можа выбрацца з балота. Пенсіянер паспеў расказаць, дзе ён знаходзіцца — зарыентаваўся па апорах ліній электрапередач. Аднак неўзабаве тэлефон грыбніка разрадзіўся. Да пошуку падключыліся супрацоўнікі МНС і міліцыі, якія «прачасалі» каля 15 км лясного масіву, перш чым бліжэй да ночы знайсці пенсіянера. Сталы мужчына стаяў у балоце па пояс у вадзе. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, мужчына, на шчасце, не пацярпеў, і шпіталізацыя не спатрэбілася.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПАЙШЛІ Ў ГРЫБЫ І... ЗНІКЛІ

У гэтым месяцы на Віцебшчыне выратавальнікі адшукалі ў лясах ужо 6 чалавек, якія пайшлі ў грыбы і заблудзіліся.

— Але колькі тых, хто не звяртаўся па дапамогу ў службу выратавання, блукалі ў лесе гадзінамі, нават суткамі. У кагосьці не было пры сабе мабільнага тэлефона, а хтосьці не паведаміў суседзям ці сваякам, што пайшоў у лес, — кажуць у Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях.

У Бешанковіцкім раёне 54-гадовая жанчына блукала па лесе суткі. І яе шукалі. На шчасце, яна самастойна выйшла з лесу і не пацярпела. А на днях дапамога спатрэбілася пенсіянеру з Віцебска, які адправіўся ў грыбы ў Гарадоцкі раён і здолеў выйсці з лесу толькі а поўначы.

— Каб не заблудзіцца ў лесе, рэкамендуецца браць з сабой мабільны тэлефон як мага больш зараджаны. А калі вы дрэнна арыентуецеся, лепш не рызыкуйце і не заходзьце глыбока ў лес, вяртайцеся не пазней за 15 гадзін. У экстранных выпадках тэлефануйце па нумарах 101 або 112, — параілі ў службе выратавання.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

27 КГ ГЕРАІНУ НЕ ДОЙДУЦЬ ДА СПАЖЫЎЦА

У момант закладкі наркотыкаў у схованку, размешчаную ля трасы Магілёў—Мсціслаў, супрацоўнікі Камітэта дзяржбяспекі і байцы спецпадраздзялення «Альфа» затрымалі траіх удзельнікаў злачыннай групы — грамадзян Казахстана і Расіі (абое ўраджэнцы Чэчэнскай Рэспублікі) і грамадзяніна Таджыкістана. На месцы здарэння быў канфіскаваны ўпакаваны гераін.

Як паведамляюць у прэс-службе КДБ, 27,5 кг наркотыку прызначаліся для рэалізацыі ў Заходняй Еўропе. Арыенціровачны кошт такой колькасці на «чорным рынку» — звыш 3 млн долараў. Затрыманым пагражае пазбаўленне волі ад 8 да 13 гадоў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ЗАРАБІЎ» НА КУХНЯХ 600 МІЛЬЁНАЎ

Цікавы спосаб добра зарабіць прыдумаў 33-гадовы мінчанін. Ён зарэгістраваўся як індывідуальны прадпрымальнік, арандаваў павільён на рынку «Ждановічы» і пачаў займацца вырабам кухоннай корпуснай мэблі па індывідуальных заказах. Добрая справа скончылася нанясеннем шкоды заказчыкам, якіх махляр «вадзіў за нос», на суму больш за 600 мільёнаў рублёў. У міліцыю ўжо звярнуліся з заявамі 18 пацярпелых.

— Прадпрымальнік прываблівіў кліентаў італьянскімі фасадамі, якія прапаноўваў па цэнах, ніжэйшых за рынкавыя. Ахвотных зрабіць заказ знайшлося нямала, хоць нават самыя сціплыя кухні абыходзіліся заказчыкам больш чым у 36 мільёнаў рублёў, — раскрылі схему махляра ў Цэнтральным РУУС г.Мінска. — Грамадзянін браў перадаплату ў памеры 70 працэнтаў ад сумы заказу, яшчэ 20 працэнтаў заказчыкі мусілі заплаціць пасля таго, як ім паведамлялі пра гатоўнасць кухоннага гарнітура, і толькі апошнія 10 працэнтаў уносіліся, па дамоўленасці, пасля яго ўстаноўкі. Дагавор прадпрымальнік выконваў літаральна да ўнясення кліентам 90 працэнтаў грошай. А вось далей узнікалі праблемы. Адным заказчыкам махляр тлумачыў, што чакае патрэбныя камплектныя часткі, іншым скардзіўся на хваробу — сваю або сваіх блізкіх. Некаторым нават прывозіў нейкія каркасы, абяцаючы ў самы бліжэйшы час даставіць і астатняе. Кліенты верылі, чакалі. Але ж да пары жбан ваду носіць... У праваахоўных органах мяркуюць, што пацярпелых насамрэч можа быць больш, чым ужо звярнуліся з заявамі на дзеянні «прадпрымальніка».

Сяргей РАСОЛЬКА.